Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 29 (173) | 11—20 кастрычніка | 1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд за дэкаду—Я. Івашчанка.
Метэаралагічная характарыстыка і табліцы вынікаў мет. назіранняў за першую дэкаду кастрычніка—Н. Малішэўская.
С.-г. гідраметэаралагічная характарыстыка—В. Стэфановіч.
Аб ажыўленні азімых.—В. Стэфановіч.

Сінаптычны агляд

Першы дзень гэтай дэкады тэрыторыя Беларусі знаходзіцца пад уплывам вобласці паніжанага ціску (лажбінай), якая адыходзіла ад цыклона знаходзячагася ў гэты час у Скандынавіі. У гэты дзень праз тэрыторыю БССР рухаўся цёплы фронт, які падзяляў халодныя масы кантынентальнага палярнага паветра, якія знаходзіліся на тэрыторыі Еўрапейскай часткі Саюза, ад больш цёплых мас кантынентальнага паветра, якія занімалі заходнюю Еўропу. Дзякуючы праходжанню цёплага фронта ў гэты дзень назіраецца выпадзенне ападкаў і павышэнне тэмпературы паветра.

12 кастрычніка ўжо ўся тэрыторыя БССР знаходзіцца пад уплывам цёплых мас кантынентальнага палярнага паветра. У гэты дзень таксама назіраецца выпадзенне дажджу, а раніцай туманы, выклікаемыя начным ахаладжваннем. Цыклон, які 11-га кастрычніка знаходзіўся пад Скандынавіяй рухаючыся ў усходнім напрамку, 12-га ўжо захваціў Фінляндыю, і тэрыторыя Беларусі у гэты дзень цалкам знаходзіцца пад уплывам гэтага цыклона. Тым часам утварэнне ў Нарвежскім моры цэлай сэрыі цыклонаў, якія хутка рухаюцца ў паўднёва-усходнім напрамку, і з 13-га кастрычніка яны распаўсюджваюцца на Ленінградскую вобласць, Прыбалтыцкія дзяржавы, Польшчу і Беларусь. У гэтыя дні праз

Табліца вынікаў метэаралагічных … на

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %
			11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Число, калі наглад. мінімум	
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	9	8	7	4	6	6	4	3	4	7	—	6	—	14	—2	19	76
	3	Полацк	11	8	8	4	6	6	4	2	3	5	—	6	5	14	—2	18	78
	—	Вялікія-Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	7	7	7	4	6	4	4	3	2	3	—	5	4	9	0	18	85
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	10	8	7	5	7	5	3	2	2	5	—	5	—	14	—2	19	82
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	9	8	8	6	7	6	3	2	2	6	—	6	5	13	—3	19	86
	16	Менск	10	8	7	6	7	5	5	3	3	7	—	6	5	14	—4	19	75
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	8	7	7	6	7	6	6	2	2	6	—	6	5	13	—7	19	82
	25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	10	Орша	10	7	7	5	7	5	4	2	1	5	—	5	5	9	—1	18	84
	19	Горкі	8	7	7	5	7	6	4	3	2	4	—	5	5	10	—1	18	82
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	9	8	8	7	8	6	6	2	2	7	—	6	—	12	—5	19	74
	30	Мар.-Сосны	8	8	9	7	8	6	6	3	2	6	—	6	6	12	—3	19	82
	21	Магілеў	8	7	7	6	7	6	4	4	2	3	—	5	5	11	—1	20	83
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	8	8	7	6	6	7	4	5	2	2	—	6	5	12	0	16	82
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	8	8	7	7	6	7	4	5	2	4	—	6	6	11	—1	20	83
	32	Жлобін	10	8	8	7	7	7	5	6	3	4	—	5	6	11	—1	20	83
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	9	8	9	7	8	6	6	4	2	6	—	7	6	12	—3	19	82
	37	Калінкавічы	9	9	9	8	8	8	6	6	4	5	—	7	6	13	0	20	79
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	10	9	8	8	7	8	6	5	3	2	—	7	6	14	—2	20	—
	35	Васілевічы	9	9	9	8	7	8	5	6	3	4	—	7	6	14	—1	20	81
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	78

назіранняў з 11—20 кастрычніка 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны чыслы)
	Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	
76	—	—2	19	..	5.0	..	7.0	2.0	4.0	2.0	..	3.0	0.1	—	23.1	туман (14, 17)
78	--	—	—	0.4	2.0	1.0	7.0	0.1	4.0	..	..	2.0	..	—	16.5	туман (12, 17)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
85	13	—4	18	4.0	2.0	7.0	5.0	5.0	2.0	0.5	..	3.0	..	—	28.5	туман (18, 19)
82	—	1	17	0.5	5.0	1.0	6.0	0.6	0.3	3.0	0.3	2.0	0.3	—	19.0	туман (18, 19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	--	--	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—	0	19	..	2.0	6.0	10.0	5.0	3.0	0.1	..	3.0	0.1	—	29.2	туман (11, 17)
75	15	—1	19	2.0	3.0	11.0	10.0	6.0	0.4	0.4	0.2	1.0	0.6	—	34.6	туман (17, 18)
--	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
82	19	0	20	1.0	2.0	9.0	8.0	2.0	..	1.0	0.5	1.0	1.0	—	25.5	туман (16, 18)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
84	12	—1	20	4.0	2.0	6.0	9.0	4.0	..	1.0	0.3	2.0	1.0	—	29.3	туман (18, 19)
82	17	—2	18	3.0	2.0	6.0	7.0	4.0	..	..	0.4	0.1	2.0	—	24.5	туман (19, 20)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
74	7	0	19	1.0	1.0	1.0	6.0	7.0	2.0	..	..	0.3	1.0	—	19.3	туман (18, 19)
82	—	—	—	..	7.0	12.0	8.0	..	..	..	..	..	..	—	27.0	туман (18)
83	—	—	—	3.0	2.0	12.0	8.0	..	..	0.4	0.3	0.3	0.2	—	26.2	туман (18, 19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
82	—	—	—	7.0	6.0	15.0	7.0	5.0	..	1.0	2.0	..	..	—	43.0	туман (18, 19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	16	—5	20	8.0	0.2	15.0	5.0	11.0	..	0.3	0.1	0.3	0.2	—	40.1	туман (18, 19)
83	—	—	—	9.0	0.6	17.0	5.0	6.0	0.1	0.1	0.1	0.1	0.1	—	38.1	туман (12, 18)
82	—	—	—	3.0	3.0	13.0	8.0	5.0	0.1	..	..	0.2	0.4	—	32.7	туман (13, 19)
79	—	—	—	4.0	3.0	6.0	3.0	4.0	..	..	0.1	0.1	..	—	20.2	туман (19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	3.0	17.0	5.0	12.0	..	..	2.0	..	..	—	39.0	лівень (13) туман (18)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
81	—	—	—	1.0	3.0	14.0	5.0	10.0	0.2	5.0	..	0.1	0.2	—	38.5	туман (13, 20)
78	—	—2	20	3.0	4.0	4.0	10.0	5.0	..	..	0.4	..	1.0	—	27.4	туман(20) граза з град. (20)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў з 10—20 кастрычніка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю — Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю — Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя хуткасць у 10-балавай сістэме — Агульная	Сярэдняя хуткасць у 10-балавай сістэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхавага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SW	4	SW	9	—	8	6	вільготная
	3	Полацк	S	4	S	4	—	8	8	•
	—	Вялікія Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	S	4	S	7	12	9	8	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	SW	7	—	8	8	мокрая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	4	SW	12	—	8	8	вільготная
	16	Менск	SW	4	SW	7	—	8	6	мокрая
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	SW	1	NW	9	—	3	3	вільготная
	25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	10	Орша	SW	4	SW	9	—	8	6	сухая
	19	Горкі	SW	4	SW	9	5	10	9	вільготная
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	W	4	W	14	—	8	8	вільготная
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	W	9	—	8	6	•
	21	Магілеў	S	4	SW	7	—	8	8	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	SW	9	—	9	8	вільготная
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	SW	4	SW	9	—	10	10	вільготная
	32	Жлобін	SW	4	SW	9	—	9	6	•
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	W	4	W	12	—	9	8	вільготная
	37	Калінкавічы	W	4	W	9	—	9	8	сухая
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SW	4	SW	9	—	8	8	мокрая
	35	Васілевічы	SE	4	SW	17	5	9	9	вільготная
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—

тэрыторыю Беларусі праходзіць цэлы рад франтоў, што выклікае значнае выпадзенне ападкаў, і назіраецца пахмурнае, цёплае з ападкамі надвор'е.

18-га кастрычніка тэрыторыя Беларусі знаходзіцца пад уплывам павышанага ціску (род антыцыклона), які складаючыся з мас кантынентальнага арктычнага паветра выклікае паніжэнне тэмпературы паветра—раніцай 18-га і 19-га кастрычніка ад—1^0 да—4^0 з невялікай колькасцю ападкаў і ўтварэннем густых туманаў.

У апошні дзень дэкады захоўваецца такое-ж становішча, але назіраецца невялікае павышэнне т-ры паветра, выклікаемае тым, што з боку Заходняй Еўропы рухаліся больш цёплыя масы морскага палярнага паветра. У гэты дзень таксама назіраецца туман і выпадзенне дажджу дзякуючы праходжанню цёплага фронта.

Наогул, гэта дэкада характэрна цыкланічным надвор'ем з ападкамі, туманамі і ваганнем т-ры.

Я. Івашчэнка.

Метэралагічная характарыстыка з 11—20 кастрычніка 1934 г.

У тэмпературы паветра за гэту дэкаду назіраліся наступныя змены: спачатку дэкады сярэдняя сутачная т-ра трымалася даволі высокая 8—10^0, потым на працягу дэкады паступова зніжалася і 19-га дасягнула 1—4^0. У апошні дзень т-ра некалькі павысілася. Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад 5 да 7^0, была або роўна нармальнай або на 1^0 вышэй яе. Максімальная т-ра дасягала ў большасці месц 14^0, мінімальная зніжалася вельмі нізка: у Мар'інай-Горцы (Пухавіцкі р-н) да—7^0, у Слуцку да—5^0.

Ападкі размеркаваліся вельмі роўнамерна па ўсёй тэрыторыі БССР. Амаль па ўсіх станцыях яны хісталіся ад 20 да 40 мм. Выпадалі яны пераважна ў першую палову дэкады: 13-га, 14-га, 15-га. Даволі значная сутачная колькасць ападкаў назіралася ў цэнтральнай і паўднёвай зонах, дзе дасягнула 15—17 мм.

Вятры пераважалі паўднёва-заходнія, з сярэдняй хуткасцю 4 м/сек.

Воблачнасць была вельмі вялікай, 80—100% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідра-метэаралагічная характарыстыка з 11—20 кастр. 1934 г.

Справаздачная дэкада з, амаль, штодзённа выпадаючымі ападкамі была неспрыяючай для паспяховага правядзення ўборкі гародніх культур (буракі, морква, капуста) і зяблівага ворыва.

Наглядаўшыеся ў другую пяцідзёнку дэкады хістанні тэмпературы паветра з мінімумамі апускаючыміся ніжэй 0^0 і даволі значнымі дняўнымі нагрэвамі, спрыялі падрыхтоўцы (закалцы) азімых культур да зімоўкі. Становішча азімых пасеваў на апошні дзень дэкады здавальняючае.

В. Стэфановіч.

Аб ажыўленні азімых

У пэрыяд зімы 1934-35 г. будуць праводзіцца назіранні за азімымі культурамі, за іх жыццездольнасцю. Аб мэтах гэтых назіранняў, іх актуальнасці, а таксама аб мэтадах ажыўлення пісалася ў нашым бюлетэні № 19 (132) за другую дэкаду снежня 1933 года. Вызначэнне жыццездольнасці азімых зімой 1934-35 г. будзе праводзіцца агульна прынятым с/г. сэктарам Ц.У.А.Г.М.С.— маналітным мэтадам і толькі ў даследчым парадку, на некаторых метстанцыях побач з маналітным будзе праводзіцца ажыўленне цукровым і водным метадамі.

Вызначэнне жыццяздольнасці азімых метстанцыямі А.Г.М.С. БССР праводзіцца з 1931 г. Практыка мінулых гадоў паказала, што працаўнікі метстанцый праводзячыя гэтыя назіранні аўладалі як мэтодыкай гэтак і тэхнікай іх правядзення. Аднак былі паасобныя выпадкі, калі назіральнікамі дапускаліся тыя ці іншыя недакладнасці пры недастатковым апэрацыйным кіраўніцтве з боку с/г. сэктару Б. А.

Аснаўным недахопам у працы па ажыўленню ў мінулыя гады быў не своечасовы пачатак правядзення гэтай працы. Вучасткі з восені не выбіраліся і на іх не былі складзены характарыстыкі. Гэта пазбаўляла магчымасці крытычнага падыходу да атрымоўваемых лічбовых вынікаў ажыўлення і не давала магчымасці даць адказ на шэраг запытанняў узнікаючых пры апрацоўцы паступаючых матар'ялаў.

Не меншым недахопам было і тое, што дзякуючы недастатковай адказнасці некаторых мет. назіральнікаў парушаліся ўстаноўленыя тэрміны ўзяцця проб, што не давала права рабіць параўнаўчую ацэнку. Былі выпадкі затрымкі дасылкі вынікаў ажыўлення (мет. ст. Сіроціна прысылала звесткі за 2 м-цы адразу), што ў сваю чаргу зрывала своечасовасць інформацыі. Мелі месца і шэраг іншых менш значных недахопаў. Каб забяспечыць высокаякаснае і паспяховае правядзенне назіранняў за азімымі патрэбна своечасова да іх падрыхтавацца, патрэбна яшчэ раз дэталёва прапрацаваць інструкцыю і пры вядзенні назіранняў сурова прытрымлівацца яе запатрабаванняў

Пры вырубцы проб сачыць каб вырублены кусок памерам ня менш 25 см. у шырыню і 25 см. у даўжыню і глыбінёю на 25—30 см. быў суцэльным і не меў трэшчын, бо ў супраціўным выпадку могуць быць парваны карэнчыкі раслін і процант загінуўшых можа атрымацца пераўвялічаным. Бакавыя раслінкі з пашкоджанымі пры вырубцы карэнчыкамі таксама не павінны брацца ў разлік.

Адтаіванне проб патрэбна праводзіць паступова, сурова прытрымліваючыся ўказанняў інструкцыі. Трэба загадзя падрыхтаваць патрэбны для ажыўлення інвентар як скрынкі, талеркі і інш. Вучасткі для назіранняў за азімымі культурамі павінны быць ужо выбраны згодна дасланага на мет. ст. 20 і 28 жніўня распараджэнняў. На гэтыя вучасткі павінны

быць складзены характарыстыкі і павінны весціся назіранні за развіццём азімых у пэрыяд асенняй вегетацый.

Толькі пры захаванні жорсткай дысцыпліны ў працы і выкананні ўсіх запатрабаванняў інструкцыі можа быць забяспечана своечасовая і высокаякасная інфармацыя аб становішчы азімых пасеваў.

В. Стэфановіч.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Друкарня БелАН. Зак. № 312. Гарліт № 6027. Тыраж 600. 7 стар

Москва.
Софийская Набережная 38
Гидрометеорологическая
станция ЧБК

МИНСК 20 11 34 МЕНСК

БЕСПЛАТНО
Согласно пост. НКПИТ
от 18 ...
„Известия"
от 18-VIII ...

МОСКВА 35 ЛЕНИНСКИЙ 21 11 34 18

МОСКВА ЛЕНИНСКИЙ 21 11 34 17